**Логвін Т.М. (Мінск)**

**«З прыродай зліўшыся душой…»**
**(аб лірычных пейзажах Максіма Багдановіча і Мікалая Рубцова)**

Адметнае месца ў сусветным літаратурным працэсе займае мастацкая спадчына М. Багдановіча і М. Рубцова – паэтаў, якім было наканавана лёсам пайсці з жыцця заўчасна. За нядоўгі жыццёвы шлях беларускі класік стварыў свой непаўторны «Вянок», цудоўную паэтычную кнігу, якую згадваў у апошнія хвіліны: «Ў краіне светлай, дзе я ўміраю, / У белым доме ля сіняй бухты, / Я не самотны, я кнігу маю / З друкарні пана Марціна Кухты» [1, с. 268]. «Рэдкасны рускі талент, чулы да ўсяго сапраўднага», як называлі М. Рубцова, пражыў на дзесяць гадоў даўжэй за М. Багдановіча. У яго паэтычнай спадчыне чатыры зборнікі: «Лирика» (1966), «Звезда полей» (1967), «Душа хранит» (1969), «Сосен шум» (1970).

«Творы сапраўднай паэзіі маюць адну адметную якасць: яны вельмі лёгка, падчас з першага разу, затрымліваюцца і надоўга застаюцца ў памяці, – падкрэслівае Н. Гілевіч. – Тлумачыцца гэта не толькі іх праўдзівым і глыбокім зместам, вялікім чалавечым пачуццём, непаўторнымі паэтычнымі вобразамі, але і дакладнасцю радка, лагічнасцю і паслядоўнасцю думкі, натуральнасцю гучання, сакавітасцю мовы. Большасць жа вершаў Багдановіча якраз і вызначаецца гэтым» [2, с. 252]. Прырода ўзнагародзіла паэта чулай душой, маральнай сілай і духоўнай прыгажосцю. Прывабнасць яго асобы цесна звязана са здольнасцю чуйна адклікацца на чужы боль, свята верыць у лепшую будучыню шматпакутнай радзімы, пільна прыглядацца да навакольнага свету з усімі яго фарбамі і адценнямі, шанаваць родную беларускую мову.

Змешчаныя ў зборніку вершы аб роднай прыродзе «складаюць вельмі своеасаблівую старонку ў беларускай пейзажнай лірыцы, старонку, якую ў сілу абставін мог напісаць толькі Багдановіч і якую нельга паўтарыць» [2, с. 243]. Свет прыроды ў яго паэзіі здзіўляе сваёй бясконцай разнастайнасцю абрысаў, колераў, гукаў. У вершы «Цёплы вечар, ціхі вечар, свежы стог…» паэт паказвае, што валодае дарам бачыць нябачнае, чуць нячутнае, умее заўважаць узаемную спалучанасць усяго існага, адчуваць духоўную еднасць з прыродай: «Бачу я, з прыродай зліўшыся душой, / Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной, / Чую ў цішы, як расце трава» [1, с. 36].

Карціны прыроды ў вершах паэта хвалююць арганічным спалучэннем тонкага лірызму і цвярозага рэалізму, рамантычнай узнёсласцю і псіхалагічнай дакладнасцю. Сумным, элегічным настроем прасякнуты вершы «Вечар на захадзе ў попеле тушыць…», «Ноч». Вячэрняя ціша, сузіранне ў небе «зялёным, як лёд», іскрыстых зорак і бледна-сіняга маладзіка лекуюць душу лірычнага героя, напаўняюць «хоць бы на момант» растрывожанае сэрца спакоем. «Ціха ўсё было на небе, зямлі і на сэрцы…» [1, с. 150].

Падобныя шчырыя пачуцці, адчуванне непарыўнай злітнасці з прыродай, трапна, праніклліва, ва ўсёй сукупнасці перажытага перадае ў вершы «Тихая моя родина» таленавіты рускі паэт М. Рубцоў: «С каждой избою и тучею, / С громом, готовым пасть, / Чувствую самую жгучую, / Самую смертную связь» [3, с. 133]. «Совершенная и простая форма его стихов созвучна русской душе», – сказаў пра М. Рубцова яго сучаснік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«Поэтическое зодчество Рубцова, вызванное к жизни высотой духовных устремлений времени, которые уже не могли удовлетвориться “гениальными конструкциями стиха”, подтверждало необходимость новых вершин. Поэзия Рубцова была живым ручательством необходимости и возможности их достижения. Имя Рубцова стало, по существу, синонимом того поэтического явления, которое подготовило в сознании читателей переоценку ценностей, напомнив о бессмертии традиций отечественной поэзии» [3, с. 259], – сведчыць Ю. Селязнёў.

Што збліжае М. Багдановіча і М. Рубцова – паэтаў розных пакаленняў і нацыянальных культур – дык гэта любоў да «Маці-Краіны», да «ціхай радзімы», якую абодва выказваюць праз творы пейзажнай лірыкі. «Багдановіч лічыўся б выдатным паэтам і тады, калі б ён нам пакінуў толькі вершы аб роднай прыродзе» [2, с. 246], – слушна заўважыў Н. Гілевіч.

Знамянальным у гэтым сэнсе з'яўляецца верш М. Рубцова «Чудный месяц плывёт над рекою», авеяны пафасам услаўлення прыроднай рэчаіснасці: «И откуда берется такое, / Что на ветках мерцает роса, / И над родиной, полной покоя, / Так светлы по ночам небеса!» [3, с. 300]. Філасофскі роздум паэта прасякнуты глыбокім адчуваннем радзімы, як месца адзінага і непаўторнага. Сугучныя радкі, спаяныя адным настроем, ёсць і ў вершы «Ночь на родине»: «Высокий дуб. Глубокая вода. / Спокойные кругом ложатся тени. / И тихо так, как будто никогда / Природа здесь не знала потрясений!» [3, с. 231]. Для М. Рубцова прырода – гэта жыватворная прыгажосць і вечная гармонія.

Адметнымі рысамі паэтычнага почырку М. Рубцова з'яўляюцца жыццесцвярджальны пафас, эмацыянальная экспрэсія, «в нём соединились, столь естественно и столь родственно, поэтическая искренность, природность таланта с осознанной необходимостью овладения высоким профессионализмом; органическое чувство народности с причастностью к классическим традициям культуры» [3, с. 259–260].

Мастак эмацыянальна перадае сваё захапленне красой прыроды: «Незабываемые виды! Незабываемый покой!» [3, с. 200]; «Давно знакомый мир лучистый – воздушный, солнечный, цветистый» [3, с. 212]; «Удивительно светлое утро / Встретить как светлую весть!» [3, с. 125].

Матыў першаснасці прыгожага і вечнага ў жыцці і прыродзе характэрны таксама для М. Багдановіча: «І ліецца хваляй песня, – ціхі, ясны гімн вясне» [1, с. 49]; «А ў душы не змаўкае струн вясёлых перабор…» [1, с. 33]. Ён шчыра радаваўся абнаўленню і квітненню зямлі.

Вобразам-сімвалам, дарагім кожнаму з паэтаў, з’яўляецца зорка. Для М. Багдановіча – гэта сімвал кахання. Яго «Раманс» напоўнены дзіўнай пяшчотай і верай у каханне вечнае, незямное: «Зорка Венера ўзышла над зямлёю, / Светлыя згадкі з сабой прывяла..» [1, с. 51]. У паэтычнай споведзі М. Багдановіча пераважае настальгія.

Лірычны герой «Звезды полей» М. Рубцова характарызуецца пачуццём вялікай чалавечай годнасці, а зорка сімвалізуе бязмежную любоў да бацькоўскай зямлі, да ўсяго навакольнага свету: «Звезда полей горит, не угасая, / Для всех тревожных жителей земли...» [1, с. 140]. Паэт адкрыта прызнаецца: «И счастлив я, пока на белом свете, / Горит, горит звезда моих полей…».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вершаваны роздум М. Рубцова пранізаны агульначалавечым, гуманістычным пафасам.

Несмяротныя словы мастакоў назаўжды застаюцца «нечаканым дзівам» і даюць магчымасць чалавеку «мудрэць і харашэць душою».

**Літаратура**

1. Багдановіч, М. Зорка Венера : творы / М. Багдановіч. – Мінск, 1991.
2. Гілевіч, Н. «Ты не згаснеш, ясная заранaчка…» / Н. Гілевіч // У бязмежную даль : кніга пра Максіма Багдановіча. – Мінск, 1996. – С. 241–253.
3. Рубцов, Н.М. «Улетели листья…» : стихотворения / Н.М. Рубцов. – М., 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ